«Канкордия», «Хопс», «Дойла-Нимбург», «Немецко-крестьянский союз», «Баварский крестьянский союз» и других.

Активное сотрудничество академия осуществляет со Шведским университетом сельскохозяйственных наук по программе «Биология репродуктивной системы животных», в рамках которой сотрудники ВУЗа проходят обучение на международных последипломных курсах. Также повышение квалификации преподаватели ВГАВМ за рубежом проходят благодаря Национальной ассоциации врачей ветеринарной медицины в Италии.

Сотрудничество ветеринарных ВУЗов расширяется в связи с возможностью участия в международных научных конференциях и ежегодной международной выставке «Белагро».

В белорусских высших учебных заведениях проводится обучение иностранных граждан по специальностям «Ветеринарная медицина», «Ветеринарная фармация», «Ветеринарная санитария и экспертиза». Наибольшее число учащихся иностранных граждан из таких стран как: Туркменистан, Россия, Ливан, Украина. Проходят обучение также граждане Пакистана, Израиля, Индии, Ирана, Литвы, Сомали, Шри-Ланки, Эстонии, Армении, Казахстана, Узбекистана и других стран.

**Заключение.** На современном этапе осуществляется непрерывное тесное сотрудничество белорусских ветеринарных образовательных учреждений с зарубежными ветслужбами и ВУЗами аграрного профиля для обеспечения образования, соответствующего мировым стандартам.

Педагогические коллективы сельскохозяйственных учебных заведений постоянно работают над созданием и расширением спектра образовательных услуг, поиском и популяризацией перспективных дидактических технологий.

*Список литературы*

1. Морозов, Д.Д. Международный подход к ветеринарному образованию / Д.Д. Морозов // Вестник Академии ветеринарной медицины. – 2013. – № 2. – С. 3 – 4.
2. Рекомендации Всемирной организации здоровья животных – МЭБ (OIE) по компетенции новых выпускников факультетов ветеринарной медицины для обеспечения высокого качества функционирования национальных ветеринарных служб // [Электрон. ресурс]. – 2012. – Режим доступа: http://www.oie.int/fileadmin/Home/eng/Support_to_OIE_Members/Vet_Edu_AHG/DAY_1/DAYONE-B-ang-vC.pdf. – Дата доступа: 05.02.2014.

## СТАЎЛЕННЕ ЕВАНГЕЛЬСКІХ ХРЫСЦІЯН-БАПТЫСТАЎ ДА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў БССР У ПАСЛЯВАЕННЫ ЧАС

*Т.У. Касатая*
*Варшава, Інстытут славістыкі Польскай акадэміі навук (ISPAN)*

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў пасляваенны час з’явілася чарговай прычынай пільнай увагі ўладаў да евангельскіх хрысціян-баптыстаў (далей ЕХБ). У афіцыйным дыскурсе яшчэ ў даваенны час баптысты разглядаліся як “класавыя ворагі” [1, с. 97]. Бо большасць з іх мелі заможную гаспадарку і адмаўляліся ўступаць у калгасы. А калі баптысты ішлі ў калгас, то зноў-такі не выклікалі даверу. Лічылася, што яны вядуць падрыўную дзейнасць, а ўступленне ў калгас выкарыстоўваць як “шыльду” для сваёй контррэвалюцыйнай дзейнасці [1, с. 116].

Мэта працы: прасачыць стаўленне ЕХБ да калектывізацыі ў БССР у пасляваенныя гады.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне падрыхтавана на аснове матэрыялаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Выкарыстаны агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У другой палове 1940-х – пачатку 1950-х гг. упаўнаважаныя Савета па справах рэлігійных культаў (далей Савета па СРК) ў сваіх справаздачах абавязкова апісвалі стаўленне ЕХБ да калгасаў. Калі ва ўсходніх абласцях



Репозиторий ВГУ

адразу пасля вайны былі адноўлены калгасы, то ў заходніх у 1946 г. існавалі толькі 133 калгасы. Першапачаткова калектывізацыя праводзілася няспешна і адносна лагоднымі метадамі. Але ў лютым 1949 г. на XIX з'ездзе КП(б)Б было запатрабавана хутчэй завяршыць калектывізацыю ў заходніх абласцях. У выніку праведзеных мерапрыемстваў да канца 1950 г. было арганізавана 6 054 калгасаў, якія кантралявалі 85% пасяўной плошчы [2]. За 1949–1950 гг. у калгасы ўступілі і большасць ЕХБ (гл. табліцу) [3, арк. 228].

**Табліца. Сацыяльны склад ЕХБ у БССР (1949–1950 гг.)**

| Колькасць вернікаў на канец 1949 г. | | | | Колькасць вернікаў на канец 1950 г. | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Рабочыя і служачыя | Калгаснікі | Аданаасобнікі | Усяго | Рабочыя і служачыя | Калгаснікі | Аднаасобнікі | Усяго |
| 2020 | 6673 | 7187 | 15880 | 2196 | 11674 | 1204 | 15053 |

Вядома, якія метады выкарыстоўваліся, каб дасягнуць такога імклівага росту калгаснікаў. Але стаўленне вернікаў ЕХБ да калгасаў было розным. У дакладной упаўнаважанага Савета па СРК па БССР за 1949 г. сцвярджалася, што прасвітары і вернікі абшчын у вёсках усходніх абласцей БССР амаль усе з'яўляюцца членамі калгасаў, "пры гэтым не зарэгістраваны выпадкі шкодніцкай працы баптыстаў унутры калгаса" [4, арк. 50]. Калгас в. Ягораўка Касцюковіцкі р-н Магілёўскай вобл. на 90% складаўся з вернікаў ЕХБ. Сраршынёй калгаса з'яўляўся прасвітар абшчыны Чэпелеў, які сцвярджаў, што "калі ўлада ад Бога, то і нельга гнявіць Бога, усе распараджэнні ўлады трэба выконваць акуратна" [4, воп. 29, спр. 146, арк. 34]. Кіраўніцтва Касцюковіцкага раёна ставіла ў прыклад калгас у в. Ягораўка іншым калгасам. У 1949 г. два прасвітары ў Брэсцкай вобласці былі абраны старшынямі калгасаў [4, арк. 162].

Упаўнаважаныя ставіліся з насцярогай да ўступлення ў калгасы вялікай колькасці вернікаў. Складвалася дзіўная сітуацыя, калі ўлады прыкладалі ўсе намаганні, каб ЕХБ ўступалі ў калгас, але ў іх выклікаў здзіўленне той факт, што вернікі ўступалі добраахвотна і ўсёй абшчынай. Гэта сведчыць пра ўстойлівы негатыўны вобраз вернікаў у афіцыйным дыскурсе. З асаблівым недаверам улады ставіліся да вернікаў з заходніх абласцей БССР, дзе таксама некаторыя ЕХБ станоўча ставіліся да калектывізацыі. У 1948 г., напрыклад, у калгасы пайшлі ЕХБ з в. Маласельцы (25 сямей), в. Зарытава (15 сямей) і в. Белякі (46 чалавек) Баранавіцкай вобл. [4, воп. 29, спр. 693, арк. 198]. У в. Гутава Драгічынскі р-н Пінскай вобл. у адным будынку знаходзіліся хата-чытальня, кіраўніцтва калгаса і памяшканне, дзе адбываліся малітоўныя сходы мясцовай абшчыны [3, спр. 30, арк. 15].

**План будынка ў в. Гутава Драгічынскі р-н Пінскай вобл.**

<table>
<tr><td colspan="3">Хата-чытальня</td></tr>
<tr><td colspan="2">Памяшканне, дзе праходзілі малітоўныя сходы</td><td></td></tr>
<tr><td></td><td colspan="2" rowspan="2">Праўленне калгаса</td></tr>
<tr><td>Гаспадар дома</td></tr>
</table>

У сувязі з гэтым упаўнаважаны Савета па СРК прапаванаў абшчыне знайсці іншае памяшканне. Вернік абшчыны в. Міцкавічы Баранавіцкай вобл., пасля ўступлення ў калгас сцвярджаў, што "як пры Польшчы, так і пры савецкай уладзе, калі ён быў аднаасобнікам яму і не снілася такая колькасць хлеба (атрымаў 3 тоны хлеба і 900 руб. на сям'ю з чатырох чалавек – Т.К.)" [3, арк. 175].

Большасць ЕХБ усё ж такі негатыўна ўспрыняла калектывізацыю. Вернікі Хоцімскай абшчыны Магілёўскай вобл. падчас засыпкі насенных фондаў казалі калгаснікам: "Вы давайце менш у насенныя фонды, калгасаў усё роўна не будзе" [4, воп. 29, спр. 146, арк. 34]. Прасвітар абшчыны ў в. Толкава, Драгічанскі р-н Брэсцкай вобл. Іван Саковіч сцвярджаў: "Калгасы ёсць параджэнне пекла, якое створана сатанінскай



Репозиторий ВГУ

уладай для знішчэння народа” [4, воп. 29, спр. 146, арк. 26]. Сярод вернікаў праз так званыя “святыя лісты” распаўсюджваліся чуткі пра тое, што пасля выбараў у Вярхоўны Савет калгасы распусцяць” [4, воп. 29, спр. 146, арк. 36]. Прапаведнік з в. Лазаўцы, Івацэвіцкі р-н Міхаіл Дзікан падчас выступлення перад вернікамі казаў па-прароцкі: “Усё роўна не будзе так, як думаюць камуністы, хаця яны ў в. Сакоўцы (Івацэвіцкі р-н – Т.К.) і арганізавалі калгас, але на гэтым праваляцца. Бо кожны разумее, што яны муцяць народ, усё роўна калгасаў не будзе, а з імі і савецкай улады” [4, воп. 29, спр. 146, арк. 25]. Такім чынам, антыкалгасныя выступленні ЕХБ былі абумоўлены агульным антысавецкім супрацівам вернікаў. Прасвітары абшчын у вёсках Хвоева, Роскаш і Косцевічы Баранавіцкай вобл. адмаўляліся не толькі ўступаць у калгас, але і выступалі супраць “Жніveньскага пагаднення”[2]. Бо з’яўляліся пяцідзесятнікамі і толькі фармальна ўваходзілі ў Саюз ЕХБ, парушаючы пры гэтым “савецкае заканадаўства аб культах”. У хуткім часе прасвітары былі арыштаваны [3, спр. 22, арк. 58].

Адмова ўступаць у калгас, ці крытыка калектывізацыі з боку ЕХБ выкарыстоўваліся уладамі для пераследу і рэпрэсій актыўных вернікаў. Прасвітара Хвоеўскай абшчыны Баранавіцкай вобл. С. Новіка абвінавацілі ў падбухторванні вернікаў і арыштавалі. У 1951 г. на 25 гадоў прысудзілі прасвітара абшчыны в. Свішчы, Жабінкаўскі р-н Брэсцкай вобл. Вайтовіча за выказванне: “Калі ў 1950 г. ураджай у калгасах быў добры, а калгаснікі атрымалі на працадзень мала, то ў гэтым годзе калі ўраджай слабы, то калгаснікі нічога не атрымаюць” [3, спр. 28, арк. 180]. У 1948 г. гаспадарку старэйшага прасвітара па Гродзенскай вобласці К.І. Сявашкі прызналі кулацкай, а самаго прасвітара арыштавалі [5].

Уступленне ў калгасы вернікаў, як і большасці вяскоўцаў, адбывалася пад прымусам. Напрыклад, намеснік старэйшага прасвітара па БССР І. Панько сцвярджаў, што яго прымусілі падпісаць заяву ў калгас [4, спр. 162, арк. 105]. Каб пазбегнуць уступлення ў калгас некаторыя вернікі выязджалі ў горад. У справаздачы за 1952 г. упаўнаважаны Савета па СРК па Маладзечанскай вобласці сцвярджаў: “Тры гады таму ў Маладзечне былі толькі 5 членаў абшчыны, астатнія 49 прыехалі з вёсак. Яны выехалі ў горад, каб пазбегнуць уступлення ў калгас” [4, спр. 348, арк. 78]. Прасвітар абшчыны ў в. Мількі Маладзечанскай вобл. Пётр Ярук, каб не ўступаць у калгас пераехаў у пасёлак Юрацішкі, дзе хацеў уладкавацца на працу. Але Юрацішкаўскі райвыканкам у пачатку 1951 г. адправіў яго на лесанарыхтоўкі ў Карэла-Фінскую ССР на 8 месяцаў [3, спр. 30, арк. 30].

**Заключэнне.** Прычынамі негатыўнага стаўлення да калектывізацыі былі не толькі антысавецкія настроі вернікаў ЕХБ, але і асаблівасць іх веравучэння. Адным з асноўных яго прынцыпаў з’яўляецца пратэстанцкая этыка, якая заснавана на каштоўнасці добрасумленнай працы, якая прыносіць прыбытак. У калгасах першапачаткова не было прыбытку, што не задавальняла вернікаў, якія мелі вялікія сем’і. Не бачылі ЕХБ і вартасці руплівай працы, калі ад аднаго чалавека часцей за ўсё не залежыў агульны вынік. А калі ў калгасы ўступалі абшчынамі і яны станавіліся ўзорнымі з высокай прадуктыўнасцю працы, то ўлады ўспрымалі гэта недаверліва з прычыны існавання жорсткай мадэлі рэлігійнай палітыкі ў БССР, якая была арыентава на поўнае выкараненне рэлігіі.

*Спіс літаратуры*

1. Чудноўцаў, М. Царкоўнікі і сэктанты ў змаганьні супроць колгасаў / М. Чудноўцаў. – Менск.: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі Партассэктар, 1931. – 143 с.
2. Мірановіч, Я. Навейшая гісторыя Беларусі / Я. Мірановіч. – Беласток, 1999. – 270 с. – Рэжым доступу - http://kamunikat.org/download.php?item=3216-8.html&pubref=3216 – Дата доступу: 07.02.2014
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 952. – Воп. 2. – Спр. 23.
4. НАРБ. – Ф. 4п. – Воп. 62. – Спр. 68.
5. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. – Ф. 1385. – Воп. 1[а]. – Спр. 10. – Арк. 15.

[2] Пагадненне паміж ЕХБ і пяцідзесятнікамі аб уваходжанні апошніх у Саюз ЕХБ. Было падпісана пад прымусам уладаў.



Рэпазіторый ВДУ